# Прэзентацыя
# па беларускай мове
# па тэме «Прыслоўе»

***для слухачоў***
***падрыхтоўчага аддзялення,***
***падрыхтоўчых курсаў,***
***абітурыентаў***

**Складальнік – дацэнт Чайкова С.В.**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# ПРЫСЛОЎЕ:

~~ступені параўнання прыслоўяў~~;
сінтаксічная функцыя;
правапіс не (ня)з прыслоўямі;
правапіс прыслоўяў і падобных да іх спалучэнняў разам, асобна

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

і праз злучок»

# Ступені параўнання прыслоўяў

| ВЫШЭЙШАЯ | | НАЙВЫШЭЙШАЯ | |
|---|---|---|---|
| простая форма | складаная форма | простая форма | складаная форма |
| прыслоўе + суфіксы –ей/–эй:<br>*смялей, вышэй* | **больш**/**менш** + прыслоўе:<br>*больш якасна*<br>*менш важна* | прыстаўка **най–** + простая форма вышэйшай ступені:<br>*найвышэй*<br>*найсмялей* | **найбольш**/**найменш**/ **надзвычай**+ прыслоўе:<br>*найбольш выразна*<br>*найменш важна*<br>*надзвычай якасна* |
| суплетыўны спосаб:<br>*добра – лепш*<br>*многа – больш* | | | простая форма вышэйшай ступені + ***за ўсё***/ ***за ўсіх***:<br>*вышэй за ўсіх*<br>*лепш за ўсё* |

**ЗАЎВАГІ!**

***Суплетывізм*** (ад лац. suppletivus 'дадатковы') – утварэнне формаў аднаго і таго ж слова ад розных каранёў ці асноў.

***Адвербіялізацыя*** (ад лац. adverbium 'прыслоўе') – пераход зменных часцін мовы ў прыслоўі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ
ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Сінтаксічная функцыя прыслоўяў

| Член сказа | | Прыклады | Заўвагі |
|---|---|---|---|
| акалічнасць | часу | Вясной палескія рэкі выходзяць з берагоў. | |
| | ступень якасці | Вясна прыйшла неяк раптоўна. | |
| | месца | Здалёк і зблізку бялеюцца на дубах буслы. | |
| | мэты | Башлакоў знарок гаварыў стрымана. | |
| недапасаванае азначэнне | | Дарога дамоў заўсёды карацейшая, чым з дому. | |
| выказнік | | Свята ўжо хутка. | |
| дзейнік | | Гэтае “калі” не давала спакою. | Пры субстантывацыі |
| дапаўненне | | Пісьменнік расказвае пра нашае сёння. | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# ПРАЗ ЗЛУЧОК ПІШУЦЦА ПРЫСЛОЎІ ЎТВОРАНЫЯ:

1) з дапамогай:

- прыстаўкі ***па-***...-і суфіксаў -***аму***/-***яму***/-***о́му***/-***му***: *па-ударнаму, па-летняму, па-свойму;*
- прыстаўкі ***па***-...і суфіксаў –***ску*** /-***цку***: *па-беларуску, па-нямецку,*
- прыстаўкі ***па***-...і суфіксаў –***і*** /-***ы***: *па-воўчы;*
- прыстаўкі ***па***- і парадкавага лічэбніка: *па-першае, па-пятае;*
- прыстаўкі ***абы***-...: *абы-хто, абы-дзе, абы-як;*
- постфікса ...-***небудзь***: *хто-небудзь, калі-небудь;*

2) утвораныя

- паўтарэннем аднаго і таго ж слова (з далучэннем прыстаўкі або без яе): *ледзь-ледзь, сам-насам, раз-пораз;*
- са слоў-антонімаў: *воляй-няволяй;*
- са слоў-сінонімаў: *сям-там;*

*3) а таксама:*

- тэхнічны тэрмін *на-гара*, што мае ‘наверх’;
- прыслоўі ***зноў***, ***усё***, ***так***, ***даволі*** з часціцай ***такі***: *зноў-такі, усё-такі, так-такі, даволі-такі*

(***Заўвага!*** Спалучэнне ***усё ж такі*** пішацца асобна, бо часціца ***такі*** пішацца асобна ад часціцы ***ж***).

# Разам пішуцца прыслоўі:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ
ИМ.Ф.СКОРИНЫ

- утвораныя ад прыназоўніка з прыслоўем: *назаўтра, назаўсёды, неяк, нідзе, незадоўга, нясмела;*
- утвораныя ад прыслоўя з дапамогайй постфікса -***сьці***: *кудысьці, штосьці;*
- утвораныя ад назоўнікаў, якія ў сучаснай беларускай мове не ўжываюцца: *дашчэнту, наўзрыд, спакон, упокат;*
- якія маюць у сваім складзе назоўнікі: ***верх, ніз, перад, зад, бок, гара, даль, высь, глыб***, ***пачатак, раз, век, ранак, дзень, вечар, ноч***: *збоку, знізу, навек, зранку, але з ранку да вечара;*
- у склад якіх уваходзяць словы ***што-***,-***сама***: *штогод, таксама;*
- у склад якіх уваходзяць словы ***міма-***, ***свое-***: *мімаволі, мімаходам, мімалётна, своеасабліва;*
- калі паміж прыназоўнікам і назоўнікам, ад якіх утварылася прыслоўе, нельга ўставіць азначэнне або паставіць пытанне да назоўніка: *наадрэз, замужам.*

Не блытаць! *За (маім) мужам стаяла мая сястра;*

- утвораныя ад прыназоўніка і поўнага прыметніка: *збольшага, урассыпную, упустую, але: на бакавую, на міравую, на папятную, у адкрытую;*
- утвораныя ад прыназоўніка і кароткага прыметніка: *дабяла, насуха, змоладу, сослепу, змалку;*

Не блытаць са спалучэннем прыназоўніка і прыметніка: *з большага сасуда, у рассыпную кашу;*

- якія маюць у сваім складзе словы ***лева***, ***права***: *злева, справа, улева, направа;*
- утвораныя ад прыназоўнікаў ***у***, ***на*** і ***за*** + лічэбнік: *удвух, надвое, заадно;* але: *у адно;*
- утвораныя ад прыназоўніка і займенніка: *вайсю, затым, потым, зусім, нізашто, нашто.*

Не блытаць са спалучэннем прыназоўніка і займенніка: *За тым дрэвам стаяў чалавек, на што пакласці сумку?*

# **Асобна** пішуцца прыслоўі і блізкія да іх спалучэнні:

- калі паміж прыназоўнікам і назоўнікамі можна ўставіць азначэнне:

*у момант (у адзін момант), у тупік (папаў у такі тупік);*

- калі назоўнік у пэўным (адным) значэнні захаваў хаця б некаторыя склонавыя формы з прыназоўнікамі: *пад пахі, пад паху, пад пахамі; па часе, да часу, з часам; на карачкі, на карачках;*
- блізкія па значэнні да прыслоўяў спалучэнні назоўнікаў з прыназоўнікамі:

**без**: без упынку, без аглядкі, без разбору, без толку;

**да**: *да зарэзу, да адвалу, да ўпаду;*

**на**: *на бягу, на ляту, на хаду, на скаку, на смак, на жаль, на дзіва, на памяць;*

**з**: *з налёту, з разбегу, з разгону;*

- спалучэнні адмоўяў ***не*** і ***ні*** з прыназоўнікавымі формамі назоўнікаў:

*не ў меру, не ў пару, не да смаку, ні на ёту, ні за грош;*

- назоўнікі ў месным склоне множнага ліку з прыназоўнікамі ***у*** і ***на***, якія маюць значэнне месцазнаходжання, часу, стану (фізічнага і душэўнага): *у галавах, у нагах, у вяках;*
- спалучэнні назоўнікаў, якія пачынаюцца з галоснай (акрамя ***о*** і ***у***) ад прыназоўніка ***у***: *у абхват, у абдымку, у абрэз, у адзіночку;*
- прыназоўнік ***па*** ад лічэбніка: *па двое, па трое;*
- выразы *ўсё роўна, усё адно, як след;* але: ***якраз***.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ
ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# ПРАВАПІС ПРЫСЛОЎЯЎ ПРАЗ ЗЛУЧОК

| ПА-… ОМУ/АМУ/ЯМУ/МУ | ПА-…СКУ/ЦКУ | ДЗЕ-…/ …-НЕБУДЗЬ | ПАЎТАРЭННІ |
|---|---|---|---|
| | па-апякунску | | вось-вось |
| па-арлінаму | па-арабску | дзе-небудзь | далёка-далёка |
| па-вашаму | па-армейску | дзе-нідзе | ледзь-ледзь |
| па-веснавому | па-армянску | дзе-колечы | |
| па-дамашняму | па-беларуску | колькі-небудзь | з прыстаўкай у 2-ім слове |
| па-даўняму | па-бацькоўску | куды-небудзь | |
| па-добраму | па-гаспадарску | | |
| па-звычайнаму | па-польску | ПА-… парадкавы лічэбнік | калі-нікалі |
| па-начному | па-руску | | куды-нікуды |
| па-новаму | па-суседску | | крыж-накрыж |
| па-свойму | па-пластунску | | мала-памалу |
| па-святочнаму | | па-першае | раз-пораз |
| па-старому | АБЫ-… | па-другое | перш-наперш |
| па-ранейшаму | | па-трэцяе | |
| па-твойму | абы-адкуль | па-чацвёртае | СІНОНІМЫ/АНТОНІМЫ |
| | абы-дзе | | сям-там |
| ПА-…Ы/І | абы-калі | НА-ГАРА | там-сям |
| па-воўчы | абы-колькі | | туды-сюды |
| па-дзіцячы | абы-куды | | сюды-туды |
| па-латыні | абы-як | | воленс-ноленс |
| па-старэчы | | | (кніжн.) |
| па-чалавечы | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# ПРАВАПІС ПРЫСЛОЎЯЎ АСОБНА

| БЕЗ | ЗА/З | НА | НЕ | ПА | У |
|---|---|---|---|---|---|
| без аглядкі | за дзякуй | на бягу | не да смаку | па адным | у абдымку(і) |
| без дай | за граніцай | на віду | не да твару | па двое | у абмен |
| прычыны | з-за граніцы | на гвалт | не з рукі | па душы | у абрэз |
| без канца | за мяжой | на грэх | не ў лад | па горла | у абцяжку |
| без поспеху | за мяжу | на дзіва | не ў меру | па завуголлі | у абхват |
| без разбору | з-за мяжы | на жаль | не ў пару | па меры | у адзіночку |
| без упынку | з гарачкі | на злосць | не пад сілу | па памяці | у адно |
| без толку | з налёту | на карачкі | не да смеху | па парадку | у вяках |
| | з наскоку | на карачках | не да спеху | па трое | у галавах |
| **ДА** | з перапуду | на ляту | | па часе | у нагах |
| да душы | з разбегу | на памяць | **НІ** | | у меры |
| да заўтра | з разгону | на памяці | ні за грош | **ПАД** | у тупік |
| да змогі | з размаху | на плыву | ні на ёту | пад вечар | у час |
| да адвалу | з ходу | на руку | | пад пахі | у рэшце рэшт |
| да зарэзу | з цягам | на скаку | **ПРАЗ** | пад паху | у розніцу |
| да ўпаду | з цямна | на славу | праз меру | пад пахамі | усё адно |
| да смерці | з часу на | на слых | | | усё роўна |
| да часу | час | на смех | | **ШТО** | |
| (часціца) | з часам | на хаду | | пакуль што | **ЯК** |
| | | наўрад ці | | толькі што | як бачыш |
| | | | | | як быццам |
| | | | | | як след |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Слоўнік правапісу прыслоўяў
# і блізкіх да іх спалучэнняў

| РАЗАМ ПІШУЦЦА | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Абáпал** | зводдаль | **Кандзібоберам** | навакóл | наогул | напотым | наўздалую |
| апоўдні | звонку | (хадзіць | (навóкал) | напавал | направа | наўдачу |
| апоўначы | звысоку | кандзібоберам) | навылет | напавер | напракат | наўзамен |
| **Бесперастанку** | здаўна | | навыперадкі | напаверх | напрыклад | наўзбоч |
| беспамылкова | здаўных | **Леваруч** | нагбом (разм.) | напагатове | напрасткі | наўздагад |
| безупынна | ззаду | | наглуха | напавал | напрост | наўздагон |
| бязмала | здалёк | **Мімаволі** | назаўжды | напаказ | напярэдадні | наўздзіў |
| бясконца | злёгку | мімавольна | надвячоркам | напалавіну | напярэймы | наўздоўж |
| **Ваўсю** | знадворку | мімаволі | надосвітку | напалову | напралом | наўкол(а) |
| вокамгненна | знізу | мімаездам | надоўга | напапалам | нарасхват | наўкос |
| **Галаруч** (разм.) | знячэўку | мімалётам | надта | напаўафіцыйна | нараспеў | наўзрыд |
| галаслоўна | знянацку | мімалётна | надыспадам | напаўафіцыяльна | нараспашку | наўпрост |
| гэтаксама | змалку | мімаходам | назад | напаўголаса | нарасхліст | наўскос |
| **Заадно** | змоладу | мімаходзь | назаўтра | напаўдарозе | нарóсхрыст | наўме |
| задарам(а) | зранку | | назаўсёды | напаўпаварота | насілу | наўрад |
| задоўга | зроду | **Наабапал** | назло | напаўсілы | наскрозь | наўскасяк |
| зажыва | зрэдку | наадварот | назусім | напаўсур’ёзна | насмелую | наўскач |
| залетась | зусім | наадрэз | наколькі | наперад | настолькі | наўскід |
| замала | **даволі** | наапашкі | накрыж | наперадзе | насторч | наўсцяж |
| замнога | дагэтуль | наверх | налева | наперакор | насцеж | наўцёк |
| замужам | дадому | наверсе | намала | наперарэз | насупраць | наўцёкі |
| запанібрата | данізу | навечна | намнога | наперасменку | насустрач | наўцекача |
| заўчора | даспадобы | навідавоку | наніз | напоперак | насустрэчу | нашмат |
| затым | дахаты | навобмацак | | | | нашто |
| зацемна | дашчэнту | наводшыбе | | | | |
| збольшага | | | | | | |
| звечара | | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# (ПРАЦЯГ) РАЗАМ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| НЕзнарок | Паасобку | Таксама | упачатку | Штодзень | УТВОРАНЫЯ: |
| неўдагад | паблізу | тамсама | уперад | штомесяц | *ад кароткіх* |
| неўзабаве | павек | Увачавідкі | уперадзе | штолета | *форм* |
| неўпапад | паволі | убок | уперамежку | штоночы штораз | *прыметнікаў* |
| неўпрыкмет | падвечар | уваччу | уперамешку | штотыдня | дабяла |
| неўспадзеў | падоўгу | уверх | упершыню | штохвілінна | дасуха |
| няўцям | падрад | уверсе | ушчэнт | | дасыта |
| неўзабаве | падчас | увечар | уплаў | Якраз | дацемна |
| неўзаметку | пазалетась | увечары | упокат | | дачырвана |
| неўзабаве | пазаўчора | увосень | упоперак | УТВОРАНЫЯ: | дачыста |
| неўзаметку | пакрысе | уброд | употай | *ад лічэбнікаў* | змалку |
| неўпапад | паволі | углыб | управа | удвая | змоладу |
| неўправарот | паняволі | уголас | упрысядкі | удваіх | насуха |
| неўпрыкмет | паперад | угрунь | упрытык | удвух | папросту |
| нехаця | папраўдзе | удзень | упустую | удзвюх | пароўну |
| неяк | паслязаўтра | удвайне | уразброд | надвое | паціху |
| Ніадкуль | Сослепу | удажкі | уразнабой | натрое | сослепу |
| нідзе | спадылба | удоўж | уранку | утрая | |
| нізавошта | спакон | удубальт | уранні | утраіх | |
| нізашто | спачатку | узад | урассыпную | утройчы | |
| ніколі | спрадвеку | узадзе | урэшце | утрох | |
| нікольki | спярша | узімку | услед | натрое | |
| нішто | своечасова | улад | усляпую | усемярых | |
| ніякавата | своеасабліва | улева | усур’ёз | учатырох | |
| ніяк | скраю | улёт | усутыч | | |
| | | уніз | ушчыльную | | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Правапіс *не* (*ня*) з прыслоўямі

| *Разам* | *Асобна* |
| --- | --- |
| • калі прыслоўе без ***не***- (***ня***-) не ўжываецца: *неабходна, нельга;* | • з прыслоўямі, калі пры іх ёсць або падразумяваецца супрацьпастаўленне: *не блізка, а далёка* (павінны быць словы-антонімы); |
| • калі ***не***-(***ня***-) надае прыслоўям значэнне, процілеглае таму, што маюць цэлыя словы без гэтай прыстаўкі: *нямного (мала);* | • са словамі варта, трэба, шкада, супраць, якія выступаюць у ролі выказніка ці аднаго з яго кампанентаў: *для сябра нічога не шкада; не трэба скардзіцца на лёс;* |
| • з прыслоўямі, пры якіх ужываюцца паясняльныя словы са значэннем ступені якасці: ***вельмі, выключна, у вышэйшай ступені, надзвычай, зусім, амаль, часткова, цалкам, поўнасцю***: *вельмі нялегка;* | • з формамі вышэйшай ступені параўнання прыслоўяў: *не лепш за іншых;* |
| • з няпэўнымі прыслоўямі, калі на ***не***- прыпадае націск: *нехта, недзе, некуды, некалі;* | • у складзе ўзмацняльных адмоўяў: ***далёка не***, ***зусім не***, ***нічуць не***, ***нcolькі не***: *зусім не прынцыпова, нколькі не холадна, нічуць не страшна;* |
| • у прыслоўях: *нехаця, нельга .* | • з прыслоўямі пры актуалізацыі адмаўлення: *не туды, не там;* |
| | • з прыслоўямі, якія заканчваюцца не на ***-а*** (яны пішуцца па агульным правілам): *не замужам, не вельмі.* |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ